**Аляксей Галаскок**



Аляксей ГАЛАСКОК

# Я ШЧАСЛІВЫ…

## Слова даецца нялёгка

***У кожнага ў жыцці ёсць вышыня, якую ён павінен калісьці ўзяць. Аляксей Пятровіч упэўнена ідзе да яе, разважна, не спяшаючыся. А колькі іх, вышынь, у жыцці?.. Галоўная, спадзяёмся, яшчэ наперадзе.***

***Прайшоўшы не адну тысячу кіламетраў свайго вайсковага жыцця і змяніўшы яго на цывільнае, ён вярнуўся на Радзіму, у сваю родную старонку, якая для яго, сапраўды падобная на рай, дзе заўсёды ёсць адзінства лесу, зор і вады... Ён вярнуўся, каб пачаць сваё "новае" жыццё... І, мабыць, нездарма ў адным з вершаў Пімен Панчанка пісаў:***

***Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,***
***Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны.***

***Так і Аляксей Пятровіч чэрпае ўспаміны у роднай старонцы, стараецца занатаваць у сваіх вершаваных радках усё тое, што пражыў сам, што запомнілася яму ад сустрэч з людзьмі, з якімі лёс наканаваў сустрэцца. Усе яго вершы адлюстроўваюць дабрыню і шчырасць. Свой родны край ён любіць як часцінку Бацькаўшчыны, - любіць і ганарыцца тым, што на гэтай зямлі застанецца і яго след. Так, ён шчаслівы – і ў гэтым шчыра прызнаецца вершаванным радком:.***

***Я шчаслівы, бо я нарадзіўся***
***У руплівых набожных бацькоў.***
***На каханай і вернай жаніўся,***
***Дзетак добрых "прыдбаў" у буслоў...***

***...Я шчаслівы, бо парасткі-ўнукі***
***Паднімаюцца шумна з зямлі...***
***...Я шчаслівы, бо я застануся***
***Дробнай рысачкай у праўнуках жыць...***

***Аляксей Пятровіч любіць жыццё і стараецца перадаць гэту любоў усім аматарам яго творчасці. Ён спрабуе свае сілы ў паэзіі, прозе і іншых жанрах. І мы спадзяёмся, што зборнікі яго новых вершаў будуць не апошнімі ластаўкамі ў беларускай літаратуры.***

***Дык працуйце, паважаны Аляксей Пятровіч, у галіне літаратуры і надалей, спрабуйце брацца за ўсё, а там... час адбярэ, што ў вас лепей атрымаецц. Бо напісанае не знікае, яно застаецца для нашчадкаў. У кожнага хто прыйшоў у літаратуру - шлях, на вяршыню якога можна трапіць толькі з дапамогай працы.***

***Поспехаў у творчасці і здзяйсненняў вашых мар жадам вам мы,***
**работнікі раённай дзіцячай бібліятэкі.**

## Я шчаслівы...

Я шчаслівы, бо я нарадзіўся
У руплівых набожных бацькоў.
На каханай і вернай ажаніўся,
Дзетак добрых “прыдбаў” у буслоў.

Я шчаслівы, бо я на магілы
Прыязджаю наведаць дзядоў.
Мне так радасна жыць сярод мілых,
Беларускіх палёў і лясоў.

Я шчаслівы, што я не бязродны,
Бо куток запаветны знайшоў.
Нават сёння сваяк мяне кожны
Запрашае, каб у хату зайшоў.

Я шчаслівы, бо парасткі-ўнукі
Паднімаюцца шумна з зямлі.
І што жонкі гаючыя рукі
Двойчы смерць ад мяне адвялі.

Я шчаслівы, бо я застануся
Дробнай рыскай у праўнуках жыць.
Праз стагоддзі назад я вярнуся
Свежым ветрыкам навальніц.

***

Сёння восень на маім двары,
А на скронях нечаканы іней.
Адлятаюць даўнія сябры
Безгалосым незваротным клінам.

Ноч са мною стала сябраваць –

Не магу заплюшчыць доўга вочы.
Успаміны не даюць мне спаць,
Маё сэрца сцішыцца не хоча.

Марамі лячу ў маладосць,
Думкамі - назад, у сваю хату.
Я даўно ў ёй не жаданы госць -
Гаспадар былы, дзівакаваты.

Хата перароблена даўно
На свой лад чарговымі жыльцамі.
Памянялі нават і акно
На верандзе, устаўленае намі.

Засталіся толькі нашы брама
Ды яшчэ цалейшыя кашы.
Каля плота сіраціна-камень -
Вартавым адвечным на мяжы.

Восень засыпае на двары
Жоўтым лісцем тое, што збылося.
Ледзь відаць пад ім мае сляды...
А зіма здалёк крычыць, галосіць.

## Мае дзяды

Мае дзяды былі такімі рознымі :
З усмешкай жыў каваль Андрэй,
Васіль-цясляр здаваўся грозным
І вельмі строгім да людзей.

Майстры яны былі на славу.
Сярпы, плугі каваў Андрэй.
Васіль - хлявы і хаты ставіў,
Ды ладна так, бы чарадзей.

Сыны чатыры, як дубочкі,
Узняліся з каранёў Андрэя.
А ў Васіля чатыры дочкі
Цвілі ў хаце, бы лілеі.

Няма даўно маіх дзядоў.
Век дажываюць іх сады і хаты.
А кожны яблык з тых садоў
Маленькім стаў і гаркаватым.

Род адмірае Васіля -
Ляскевічаў амаль няма на свеце.
А з Галаскокаў застаюся толькі я,
Стрыечны брат, ды нашы дзеці.

Не засталося прашчураў слядоў,
Іх замяла жыццёвая завея.
Я не заўважыў, калі час прайшоў:
Што сам ужо дзед і быццам сад старэю.

## Чужая маці

Зжаўцелыя фіранкі на акне
У згорбленай, счарнелай хаце.
Так хочацца зайсці ў адведкі мне
Неспадзявана да чужое маці.

Не церпіцца ў старэнькай папытаць,
Жывецца як, дзяцей ці часта бачыць.
Але баюся моцна напужаць,
Бо я не сын і мне яна не маці.

Я бачу, трэба снег паадкідаць
Ад вуліцы да веснічак і хаты.
Лапату, пэўна, ёй не ўтрымаць -
Кіёк сухі і той стаў цяжкаватым.

А хлеб? Ці ёсць ён на стале?
Ці бохан  з крамы ўсё ж прынесці?
Зжаўцелыя фіранкі на акне -
Ад іх мне позірк не адвесці...

***

Просіць Бога  дзед пад вішняй
Каля плота на двары:
- Божа Праведны, Усявышні,
Я нажыўся – забяры...

Не  хачу існі дадому,
У адзіноце начаваць.
Каб хто ведаў, як старому
Цяжка век свой дажываць.

Непатрэбны  стаў нікому.
Дзеці  ў  горадзе жывуць.
А такіх, як я, вядома,
З вёскі  рэдка забяруць.

Моладзь кожны дзень на працы,
Дый пакоі іх – каморы.
А я зараз  горш дзіцяці,
Бо зусім нямоглы, хворы.

Каб вярнуць гады і жонку,
Усё іначай  я б рабіў.
Ваду раніцай у вядзерку
Толькі б сам дамоў насіў.

Як  раней, карчом бы ў хаце
Не сядзеў, дапамагаў.
Зразумеў, як жонку страціў,

Што яе  не шкадаваў.

А яна  ж усё рабіла
Для мяне  і для дзяцей.
Абмывала нас, карміла...
Я ж – работу, што лягчэй.

Жонка пчолкаю лятала
У лес па ягады, грыбы.
Шмат чаго напрыбірала:
Поўны склеп – ідзі, бяры.

Мо, старэнькая, пачуеш?-
Ты да Бога ўсё ж бліжэй.
Папрасі, хай пашкадуе –
Забярэ к табе хутчэй.

***

Знішчылі  не землятрусы
Культуру ацтэкаў і майя.
Няўжо так і нас, беларусаў,
Гаротная доля чакае?

У пакутах канае мова,
І нішчаць яе не чужыя.
Квітнеючы  сад на дровы
Сякуць  беларусы былыя.

Не раз  мову з хаты гналі,
За ёй зачынялі дзверы.
Яна ж, зноў з кален уставала,
Неўміручая,  так як  і вера.

Усё жыццё  сваё ганаруся
Нашай спадчынай – роднай мовай,

Прыгажуняй маёй, Беларуссю
І яскравым бацькоўскім словам.

## 70 – годдзю М. Рудкоўскага прысвячаю...

“Дзень добры, шаноўны Міхась!”
Ніколі табе не казаў,
Бо я ў недалёкі той час
Не тут свае сцежкі таптаў.

Чаму не дазволіў мне лёс
З табою хоць раз павітацца.
І ў вёсцы, дзе жыў ты і рос,
Па-брацку, сардэчна абняцца?

Мясціны ты  мне б паказаў:
Адзінец, дзе зубр уладарыў,
Той ельнік, дзе ён паміраў,
Свае пакідаючы мары.

А потым з пахучых кублоў
Мы б сала з табой каштавалі.
Зарана з жыцця ты пайшоў
Ад нас у адвечныя далі.

“Дзень добры, шаноўны Міхась!”
Вітаю цябе я з паклонам,
А ты мяне кожны раз –
Радкамі “Залатазвона”.

## Плача каня

Плача каня над былой рачулкай,
Купінку не знойдзе  для гнязда.
Плач вісіць шчымлівы, гулкі

Над зямлёю, дзе была вада.

Хмызнякі пануюць на тым месцы,
Не відаць нат лужыны нідзе.
А калісьці тут спакуснік-месяц
З зоркамі гарэзіў у вадзе.

Шмат птушыных тут было чародак,
Моладзь адлятала з іх у свет.
І прастор быў для чаўноў і лодак...
Знішчыў усё бяздушны чалавек!

Асушыў, павыганяў бы з раю
Братоў меншых з кроўнае зямлі.
Ні лугоў, ні ворыва не маем
Там, дзе хвалі чыстыя плылі.

Продкі нашы шчыра, без падману
Дазвалялі побач жыць усім.
Не, не ў небе горка плача каня -
У сэрцы растрывожаным маім.

***

Бег да яе, думаў няспынна,
Каб хоць свой гонар не згубіць,
Бо будзе брыдка прад жанчынай,
Што яна просіць - не зрабіць!

Сустрэла, кажа мне: “Нарэшце...
Калі прыйшоў, дык не дрыжы,
Падсунься, каб хапіла месца…
Расслабся, ты ж не на крыжы!..”

“Маўчы, не трэба, каб пачулі,
Што буду я рабіць з табой.

І ведай, тут табе не гулі –
Не менш гадзіны будзеш мой!”

Ў мяне ссінелі раптам губы,
Ад слоў яе скрывіла рот,
Заляскаталі дробна зубы,
Я зразумеў: папаўся, кот.

А потым... Што яна рабіла!..
Круціўся я бы той мянтуз.
Яна мяне ўсё хваліла:
“Крышку яшчэ... мужчынай будзь!..”

Назад ішоў - дрыжалі ногі,
Быў мокрым, мяккім, быццам квач.
...Як добра, што зубоў не многа
Лячыла мне жанчына-ўрач.

## Пад каштанам

У вёсцы Нача пад каштанам,
Калі пеўні яшчэ спяць,
Мужыкова “рада” рана
Пачынае засядаць.

Павітаюцца спачатку,
Пералічаць усіх “байцоў”,
Потым лёгкім “фіззарадка” –
Травяць дымам камароў.

Кожны тут аўтарытэт –
Вёсцы шмат гадоў аддаў.
А Анцёк Свірыд - паэт,
Вершы нават друкаваў.

Усе маўчаць, і раптам слова

Нехта кіне проста так,
Успыхне полымем  размова:
Дзе, каму, за што і як?

Пра палітыку “Гамулка”
Растлумачыць слухачам:
У яго язык не мулкі,
Рэжа так, як быў сам там.

З  раніцы  “хварэюць” хлопцы:
Не  дае ім  жыць  “сушняк”.
Да васьмі, ну хоць ты лопні,
Не падлечышся ніяк.

А калі  званок  у краме
Прывітальна зазвініць,
Мужыкі гуртом  рахманым
Пабягуць пітво набыць.

Тры цукеркі і дзве пляшкі -
Вось і ўсё што змаглі ўзяць.
І з віном,  бы гусі,  важка
Крочаць  “ў ліпкі” баляваць.

- Будзьмо,-  скажуць, больш - ні слова.
Што яшчэ ў наш час жадаць?
З чаркі  дзень пачнецца  новы,
Ну, а потым, - што Бог дасць.

Дасць не дасць, назаўтра рана
Будзе  “рада” вырашаць.
У вёсцы Нача, пад каштанам:
Дзе, за што, і  колькі ўзяць?..

***

- Ну, скажы, у чым тут справа,-
Люба дзеўчына мая?
Я, як певень, злева, справа –
Ты ж халодна, бы зямля.

Ой, забава! Ой, забава,
Для мяне твая любоў:
Марны лёс, пустая справа,
А ў мяне іграе кроў.

- Мо ты ўсё не разглядзела,
Не памацала рукой:
Я такі, як ты хацела,
Абдымі, пабудзь са мной.

- Ой, забава! Ой, забава.
Для мяне твая любоў -
Быццам чэзлая атава,
А ў мяне іграе кроў.

- Пачакай яшчэ хоць крыху,
Хоць хвілінку пачакай.
Не дзяўчына ты, а ліха,
Снег халодны ў цёплы май.

Паглядзела ўлева, управа:
Ладных хлопцаў не злічыць!
- Не патрэбна мне забава,
Я з каханым буду жыць.

***

Яшчэ цвіце той бэз ружовы
На могілках вясною:
Туды для шчырае размовы
Хаваліся з табою.

Шаптала ты з адчаем мне,
Жыцця няма што ад бацькоў.
І брат ніколі не міне,
Таксама ён марнуе кроў.

Сваім і я дзяліўся болем –
Між намі тайны не было.
Па пяць гадоў было, не болей,
Табе і мне - і ўсё прайшло.

Яшчэ цвіце той бэз ружовы:
Ён стаў прытулкам салаўя.
Каб зноў у той куст, якія б словы
Сказала, ты? Якія - я ?..

## Дранікі

Цішком, у нядзельку, раненька,
Калі “мая” пад коўдрай спіць,
Рыхтую я на кухні дранікі,
Каб жонку смачным накарміць.

Спачатку добрай бульбы місу
Пачышчу і ў вадзе памыю,
А потым тру яе пакрысе,
Бы журавель, сагнуўшы шыю.

Націсну ў цеста я цыбулькі,
Ды часнаку аж два зубкі,

Падсыплю соды паўграмулькі,
Яйцо ўваб'ю, сыпну мукі.

Дабаўлю солі і алею,
Каб дранікі не падгаралі.
Патэльню хораша прагрэю –
Блінцы каб лёгка адставалі.

Далей жа "нарыхтоўку" лыжкай
Хвілінак некалькі мяшаю.
Затым пяку, і тыя пышкі
Лапаткай спрытненька здымаю.

Як застанецца цеста жменька,
Галёкаю сваёй: "Уставай!
Ідзі паснедаем, паненка,
Сама смятану налівай".

Бываюць розныя прысмакі,
А лепш няма, чым дранікі.
Салодзіць сэрца жонка: "Дзякуй!"-
Нядзелькай божай раненька.

***

На людзях - вясёлая, шумная,
Здаецца, шчаслівей няма.
А дома - сапраўдная, сумная,
Калючая, быццам зіма.

У святы танцуе, спявае,
Нікому прысесці не дасць.
Вяргіняю расцвітае,
Але не даецца сарваць.

Сваё не ўтрымала каханне:

Яно ўцякло да другой.
Казала сабе: “За чаканне
Найлепшы з усіх будзе мой.”

Найлепшыя - снегам сышлі:
Ў жыцці гэтак часта бывае.
Яны сваё шчасце знайшлі,
Яна ж і сягоння шукае.

Маўклівым шнурочкам гады,
Яе адлятаюць у неба.
І цяжка знайсці брады
Ў каханні. А мо ўжо й не трэба?

***

Дзве незнаёмыя жанчыны
Сядзелі побач на вакзале.
Раптоўна неяк, без прычыны
Адна ў другой спытала:

- Прабачце, ехаць вам куды?
Хутчэй бы ўжо дадому...
Чакаць і даганяць заўжды
Не хочацца нікому.

Было няёмка прамаўчаць,
Суседцы выпадковай.
Прыйшлося сціпла адказаць.
І пацякла размова...

Спачатку пра сваіх дзяцей
Жанчыны размаўлялі,
А праз гадзіну ці пазней?
Бы птушкі, шчабяталі.

Пра тое, што іх мужыкі
Не п’юць, збіраюць грошы.
Руплівыя, не лайдакі,
Не спяць яны “ў кошык”.

- У  нас з маім даўно любоў,
Лічы, са школьнай парты.
Раўнівы ён - да сінякоў,
Дурны, у той час і ўпарты...

А ваш хіба вас не раўнуе?
Бо вельмі вы прывабна.
- Мяне не любіць мой – шкадуе,
Чысцютка гэта праўда.

Размовы сэнс жаночай гэтай
Ад Евы свет хвалюе.
Што лепей? – калі муж кабету
Кахае, ці - шкадуе?.

## Пра бочку

З суседам нашы гаражы
Стаяць, як два грыбочкі.
Прашу яго: “Дапамажы,
Давай  прыладзім бочку!

Рыдлёўкі возьмем,  ты і я  -
Хіба  мы не мужчыны?
Вадзіца будзе  ў нас свая
Са стрэх, каб мыць машыны”.

А ён ўсё нэндзіць: “ У Машуках
Тых бочак маю многа,
Дык не нясці ж мне іх у руках
Адтуль - кусок  дарогі”.

Здаецца, больш я не  сцярплю:
Вазьму балён “замочкі”
І сам у іншага куплю,
Сабе  цыстэрну-бочку!

У дождж  мо тоны  паўтары
Вады  ў яе нальецца.
Папросіць хто, скажу: “Бяры! -
Суседу ж - дулю з перцам!

## Дыялог

-Набраўся  зноў, як жаба мулу,
Ну, пакажы, ці што прынёс.
Сам пагуляў, а жонцы – дулю?
Каб чорт цябе  да ранку трос!

Сусед  і вып’е, і цукерак
Заўсёды прынясе дамоў.
У цябе  ад іх  няма й паперак.
Усе цягнеш да сваіх сяброў.

Наш кот і той хоць раз у тыдзень,
Як зловіць мыш, дык мне нясе.
Ну, прызнавайся, стары злыдзень,
Зноў грошы “прасадзіў” усе?!

Чаго маўчыш?  Скажы хоць слова,
Бо не  ўтрымаюся  - заб’ю!
Няўжо прапіў ты нават мову?
- Ну, дзе табе  я мыш злаўлю?..

## Пятровіч

Пятровіч кожны дзень хадзіў
У халаце  чыстым, белым.
У кішэні валідол насіў,
Нахабным быў і смелым.

Любіў усім  ён расказаць
Пра справы ў медыцыне.
Казаў, што лепей папрымаць,
Калі ў вас  шкарлятына.

Палохаў, што ў апошні час
Вакол пайшлі інфаркты.
І быццам з поўначы да нас
СНІД прывязлі на нартах.

Пляткарыў пра  шызафрэнію,
Якая   з Афрыкі ідзе.
І ад яе нібы жывая
Не  ўратуемся нідзе.

Яшчэ Пятровіч павучаў,
Які сакрэт залозаў.
А сам - у бальніцы працаваў
Ўсяго толькі - “завхозам”.

***

Многія за папугая
Грошай даюць нямала.
Навучаны, ён паўтарае
За імі ўсё, што папала.

Чырвоныя, сінія ары
У клетках прыгожых сядзяць,

На жэрдачках дрэмлюць і мараць,
Што новага людзям сказаць?

За смачную ежу дармову
Ім трэба старанна крычаць.
І нават замежнаю мовай
Чужынцаў  шляхетна  вітаць.

Дурная,  нікчэмная птушка,
Нічога  з  яе  не  прыдбаеш.
Ні яек у ежу, ні тушкі,
Дый “попкай” сябе называе.

Калісьці не кінуць арэшкаў,
У сподак вады не  нальюць.
Куды ты падзенешся, Кешка?
Не усе ж папугаяў бяруць...

## Маракам – падводнікам

Далёка  ад  дому  і  роднай краіны,
Ў глыбінях халодных, чужых,
Крадзецца нячутна, бы цень, субмарына
Намечаным курсам на слых?

Лакатары лодкі - і вочы, і вушы:
Усё чуюць і бачаць наўкруг.
Яны заглядаюць у думкі і душы?
І ловяць здалёк кожны гук.

Піхаюць падлодку грабныя вінты,
Іх круцяць старанна турбіны.
З рэактара пару глытаюць яны.
Працуе  рэактар няспынна,

Дае ён на борт і цяпло, і святло,

Яго берагуць, быццам сэрца…
А што, маракі, вас з зямлі прывяло,
Сюды ў небяспечнае месца?

Вільготна ў адсеках, цяснота наўкол,
Зусім не зямное паветра.
Надзея на сябра жыве тут спакон -
Не выжыць інакш у цёмных нетрах.

У сакрэтным раёне застыне падлодка:
Дзяжурства нясе баявое.
Задраяцца шчыльна перагародкі,
Ашчэрыцца хіжная зброя.

Пасты займуць дружна ізноў маракі,
“Прыём” будзе толькі ў эфіры.
На беразе, ў Бога іх просяць, жанкі,
Паход каб закончыўся мірам.

Назад клічуць лодку сівыя прычалы,
Пачуць хочуць хвосткі равун.
І нават прыціхлі разгульныя хвалі
Сярод непрычэсаных дзюн.

Каханыя ў месцы швартоўкі стаяць:
Іх гоніць дамоў сівер-вецер -
Яны ж не адступяць і будуць чакаць
Мужчын, самых мужных у свеце.

***

Зямелька ў нас беднавата
І ўлетку халодныя ранкі,
Затое ў ветлівых хатах
Вясёлкай гарэць вышыванкі.

Жывём мы здаўна небагата,
Ратуюць нас лес, журавіны.
Пявучыя нашы дзяўчаты,
Руплівыя ў працы мужчыны.

Хоць часта жывём цеснавата,
Бо сем'і вялікія ў нас.
Затое ў нядзельку і ў свята
Чакаем дзяцей кожны раз.

Шчабечуць, спяваюць рабяты
Ў падворках бабуль і дзядоў:
Не цягне маленькіх дахаты
У горад з вясковых дамоў.

Прачнуцца яны пазнавата
І з кубачкаў п'юць сырадой.
А потым свой тварык мурзаты
Калодзежнай мыюць вадой.

Мы свой не хаваем дастатак –
Празрыстыя нашы фіранкі...
Агнём каляровым у хатах
Смяюцца, гарацць вышыванкі.

***

Жоўтым полымем дубы
Палыхаюць у восень,
А ў іх – сівыя мы
Золата не просім.

Нам каб Бог здароўя даў,
Адганяў каб старасць,
Менш было нялёгкіх спраў
І сапраўднай – радасць.

Унукі хутка каб раслі,
Помнілі нас дзеці.
І яшчэ крыху змаглі
Мы пажыць на свеце.

Каб наступны кожны год
Сустракаць – у пары,
Пасля ж нас застаўся род –
Працавіты, з марай.

## З таго жыцця...

У тым жыцці хто быў царом,
А хто araў і сеяў,
Слыў нехта мужным ваяром,
А нехта – ліхадзеем.

А я, напэўна, у пушчы жыў,
Быў пчаляром заўзятым,
Кашулю тканую насіў,
Сад пасадзіў ля хаты.

Зімою жонка мая ткала
На кроснах цуды- дываны,
Дзяцей любоўна даглядала –
Раслі здаровымі яны.

Было сямёра ў нас сыноў,
Дачушкі дзве – блізняткі.
Сярод духмяных мурагоў
Гулялі нашы статкі.

Усяго хапала той сям'і,
Найбольш свабоды, волі.
І дружна мы тады жылі –

У дастатку, з хлебам-соллю.

Чаму праз тысячу гадоў,
Ці крыху, можа, болей,
Не стаў я пчаляром ізноў,
Не буду ім ніколі?..

Шкада, што чыстае вады
Не піць з крынічкі поўнай,
І не прынесці мне сюды
Ў наш час, маёй князёўне.

## "ФЭСТ"

Гучыць у песнях наша мова,
Матыў далёкіх дзён уваскрэс.
Ансамбль цудоўны, ганаровы
З Баранавіч спявае – "Фэст".

Чаруюць скрыпка і цымбалы,
Грукоча бубен з імі ў такт.
Гармонік у руках удалых
Іграе хораша, усяляк.

Вярэдзяць душу людзям песні
Пануе цішыня у зале.
У сценах гукам крыху цесна -
У прастору рвуцца яны, далей.

Падлогу шротам б'юць абцасы,
Са столі аж міргае свет.
Якія робіць выкрунтасы
З бабуляю ў пары дзед!

Нібы варожаць песень словы,
Кранае іх багаты змест.

І пах, здаецца, чабаровы
З сабой прывёз ансамбль “Фэст”.

***

Ну, поўны я, і жонка мая поўна.
І  БАДы еў, і на дыеце быў -
А важу я за сто ўсё роўна
Вось каб яшчэ не менш і жыў!..

## Пазыка

- Здароў, сусед, ну, што, трашчыць?
- Трашчыць, а каб яно згарэла
- Прасіў цябе – даволі піць,
А ты:  - гуляем – панядзелак!

Ці помніш хоць, за што пілі,
І колькі мы напазычалі.
І песні гучна, як “раўлі”
Калі па вёсцы “вышывалі”?

- Чакай, а хто нам пазычаў?
- Хіба не помніш колькі бралі?
Язэп на дзень пазыку даў,
На вэксэль ў краме запісалі.

- Пабач і Зоня вунь ідзе:
Пэўна забраць хоча пяцёрку.
- Ну, пэўна ўсё, мяне мая заб’е,
Як паляўнічы той цяцёрку.

А як я з ёй дагаварыўся?
У яе зімою снег не ўзяць.
- Ты ж прэзідэнтам пабажыўся

І кляўся з раніцы аддаць.

- Уцякаем, брат, з табою хутка,
Бяжым у розныя бакі.
Калі мая выйдзе Анютка
Нават не каркнем, бы гракі…

У яе рука - цяжэй бязмена.
І б’е, як у бойцы “К-1”.
Заб’е мяне як цвік у сцену:
- Чаго сядзіш карчом – бяжым!

Сустрэліся сябры ля крамы
І зноўку сталі разважаць,
Каб падлячыцца, на 100 грамаў.
Дзе ім яшчэ пазыку ўзяць?..

***

Спазнаў я абдымкі тугі,
Мне сум развітання знаёмы.
Чужыя вітаў берагі,
З якіх рваўся птушкай дадому.

Калі на Радзіму ляцеў,
Здавалася, зложацца крылы:
Стагнаў, не здаваўся, цярпеў -
Адкуль толькі браліся сілы?

А сёння з Палесскай зямлі
Гляджу з захапленнем у неба
І ведаю, што не пяклі
Нідзе, як тут, смачнага хлеба.

А з нашых празрыстых крыніц
Глыточак вадзіцы спатоліць...

Я ў госці прыеду – пакліч,
А вось назаўсёды – ніколі!

У свеце ёсць многа краін
Прыгожых, цяплейшых, багатых.
А я,  шляхам стомлены сын,
Вярнуўся ў бацькоўскую хату.

Адсюль хай душа  адляціць,
Да  зорак, пад плач завірухі.
Зямля, дзе пашчасціла жыць,
Будзь мне дыванам, будзь  і  пухам.

## З празрыстай ледзяной крыніцы

З  празрыстай  ледзяной крыніцы
Пілі  вадзіцу мы ў бары.
Ты  для  мяне  зрываў суніцы
Чырвоныя, бы снегіры.

У той час не мог  ты надзівіцца
На неба сінь  ў маіх вачах.
А  я  не здолела  спыніцца
І захмялела  ў верасах...

І гэта бачыла яліна:
Яна хавала  нас з табой.
Табе  я верыла, адзіны,
Каханы мой, жаданы  мой!

Жыве крыніца-чараўніца,
Бруіць між гладкіх камянёў.
А я даўно адна чарніцы
Рву ля знаёмых верасоў.

***

Гучаць сёння  розныя песні,
Чуваць іх  па радыё нашым.
У дні нараджэнняў  Алесі
Віншуюць  сябровак Наташаў.

Жадаюць ім шчасця, кахання,
Здароўя  і светлае долі.
А вось  толькі песні-вітанні,
Бывае, абразяць да болю.

“Я ведь взрослая уже,
Ты целуй  меня везде...”,
“Сладкое место на теле
Искать будем вместе в постели...”

Губляем  мы сорам і веру.
Няўжо добрых песень не маем?
Чамусьці пра зорку Венеру
Каханым так рэдка спяваем…

***

Снег зрыжэлы споўз  у  лагчыны.
На  палях  яго няма.
Калі йдзе вясна-дзяўчына -
Уцякай, бабка-зіма.

Забірай з сабой завеі,
Маразы, празрысты лёд.
Пакідай  сабе  надзею,
Што надыдзе  новы  год.

Ты ж, вясна, бадзёрым крокам,
Абыдзі  палі, гаі.

Жыццядайным  свежым сокам
Дрэвы, кветкі напаі.

Ды пакліч дзяцей на волю,
А старэнькіх -  да  цяпла,
Жаўрукоў  - спяваць   над полем
Песні-мары  ля сяла.

Людзям стукні ў вокны, дзверы,
Свежым  ветрам разбудзі.
Ды у прыгаршчах  надзею,
Шчасце, радасць прынясі.

***

Насупраць клуба, па-за брамай
Гармонік у гэты дзень не граў.
Грымела громам фанаграма
Спявак за ёй не паспяваў.

Дзяўчынкі ў джынсах танцавалі
Агністы "дыско", жвавы "твіст"
Удалоні моладзь ім пляскала
І запрашала зноў на "біс".

Бабулі між сабой шапталі
Чаму на Спас, у такое свята,
Сукенкі не паапраналі –
Льняныя, у васількі, дзяўчаты.

Вяночкі дзе ў прыгожых стужках
Кашулі ў хлопцаў, паяскі,
Дзе знікла скрыпка, бубен гулкі -
Няўжо зламаліся смыкі.

Грымела доўга фанаграма.

Замежных песень у нас багата.
Хлапчук малы пытаў у мамы:
"Спас - гэта што, канцэрт, ці свята?

## Сасна упала

Сасна упала...Гэта ж трэба!
Учора тут яшчэ расла.
На лапах калыхала неба,
А сёння ранкам-адышла.

Гадоў ёй, пэуна, пяцьдзесят -
Дзявочы узрост як палічыць
Зламау шалены вецер-кат,
А дрэву жыць яшчэ ды жыць.

Драмаць уначы, шумець удзень,
Дурманіць свежаю смалою.
І на табе - застауся пень
Ды й ен зраўняецца з зямлею.

Не усім у жыцці спрыяе лёс
Каб не адна сасна стаяла,
Была ў бары, што побач рос
Яшчэ жыла б, яшчэ б не упала.

***

Быццам звонкай вясной ручайкі
Што бягуць усе хутчэй і хутчэй
Мы, дзяўчаты і юнакі.
Крочым дружнай сямейкай у ліцэй.

Тут нас вучаць зямельку любіць
Як араць, даглядаць трэба глебу

Як жаданых гасцей накарміць ?
Іх сустрэць намі спечаным хлебам.

Нехта з нас пабудуе дамы
Атынкуе, уставіць акенцы
Працу зробім дабротную мы –
Укладзем свае душы і сэрцы.

Прыйдзе час, назаўжды адляцім,
Быццам птушкі расправіушы крылы.
Наш паклон вам, настаунікі, усім
І табе, ЛІЦЭЙ, любы і мілы.

## Абразанне

У халадным лістападзе
Абразаў дзядок сукі.
З ім унучак быў у садзе:
Яны з дзедам – дружбакі.

- Ты навошта абразаеш
Столькі голля з добрых дрэў?
Хіба дроў зусім не маеш
Ці пад старасць звар'яцеў?

Разгубіўся дзед… Не зразу
На пытанне адказаў:
Бачыш, як смаркач абразіў!
Драбазя, а так падцяў!

- Я, саколік мой, знішчаю
Толькі хворыя сукі,
Маладзенькіх не чапаю,
Хай растуць ва ўсе бакі!

А з старых галін, унучак,

Больш нам яблыкаў не рваць.
Нат у кніжках зараз вучаць,
Як старое прыбіраць.

Вось цяпер сам будзеш ведаць,
Як хадзіць трэба ля дрэў.
- Дзед, а што табе абрэзаць,
Каб і ты памаладзеў?

Зноў збянтэжыўся старэнькі,
З паўхвіліны соп, маўчаў…
Потым буркнуў:
- От дурненькі!

Ды калі б я тое знаў,
Дык гадоў таму пятнаццаць
Знішчыў корань той ці сук!
А цяпер давай збірацца,
Змарнаваў настрой ты, ўнук!

***

Пайшлі з табой разам да рэчкі,
На мосцік над Ланню - ракой.
Пакінем турботы зямныя,
Прыціхнем над чыстай вадой.

Давай, як раней, памаўчым
І птўшак паслухаем спевы,
Уважліва зноў паглядзім
На вёскі, што справа і злева.

Ты ўсё мне раскажаш пра Начу,
Адкуль пайшла назва яе.
Як сонца схаваецца ўбачым,
Што месяц плыве па вадзе.

Яшчэ мне пра ліпы раскажаш.
Іх некалі пан тут садзіў.
А потым рукою пакажаш:
Дакуль быў ранейшы разліў.

Сустрэнем з табой зорны вечар
Праз трыццаць гадоў удваіх.
Цябе абдыму я за плечы
І вуснаў крануся тваіх…

***

Амаль мне кожны дзень чуваць:
У ахову набіраюць
Паслоў замежных вартаваць,
Хлапцоў, што выгляд маюць.

Аж метар восемдзесят пяць,
Не меней быў каб росту.
Хто не дарос - не будуць браць,
Бо той ужо не па ГОСТу.

Я ж толькі метар пяцьдзесят,
Благі і непрыкметны.
Вазьміце, буду надглядаць,
Я за паслом адметна.

Схаваюся, як мыш у куст,
Залезу спрытна ў бочку,
І буду ў ёй, бы тая гусь,
Маўчаць і дзень, і ночку.

Я за шпіёнам прасачу,
Каб не зрабіў ён шкоды.
У ахову вельмі я хачу,

Вазьміце для разводу.

***

Як здрадзіў - маўчы, не хваліся,
Не будзь салаўём тады звонкім.
Дамоў непрыкметна крадзіся,
Хавай свае вочы ад жонкі.

Інакш яна зразу пазнае:
- У каго валацуга ты быў?
Бяду сабе, гора прыдбаеш
Падумаеш: "Лепш бы не жыў"

Маркота паселіцца ў хаце,
Апусцяцца жончыны плечы.
І больш ў жыцці гэтым, браце,
З ёй побач табе не прылегчы.

Спыніся, бо шлях да каханкі
Падобны на лёд крохкі, тонкі.
Няхай лепш сустрэне на ганку
Адзіная, любая жонка.

## Шчодры рыбак

Язэп - мужчына дужы, лоўкі,
Сыноў траіх сабе "прыдбаў".
Сам працаваў на сарціроўцы,
Дзе рыбу павуком цягаў.

Не забываў пра свой мяшочак:
У яго ён большую кідаў.
Хаваў "гасцінец" у куточак,
Адкуль дамоў і забіраў.

Язэп быў не скупы - дзяліўся
Здабытым у рыбгасе скарбам.
А пасля чаркі ўсім бажыўся,
Што кожны трэці яму сябра.

Не кідаў ён на вецер слоў,
Павінен гэта я прызнаць,
Бо жоўтых, важкіх карасёў
Прынёс і мне пакаштаваць.

Не ўзяў з мяне Барыка грошай,
Адно здароўя пажадаў.
Даўно такіх людзей харошых
Не бачыў я, не сустракаў.

## Будчакі

Карась не дзенецца нідзе,
Такая ж доля шчупака.
Усё, што водзіцца ў вадзе,
Здабычай стане будчака.

Ён ловіць рыбу павуком,
У цёплы дзень - падхватам.
Ляшча аглушыць і калом
Ды прынясе да хаты.

Стары будчак, бывае, вудай
Цягае лоўка карасёў,
А малады цярпець не будзе:
Ён ловіць сеткаю - і ўсё!

Закінуць сеткі і ў чарот...
Сядзяць у ім, пільнуюць.
І ціха так, бы хітры кот,

Калі мышэй палюе.

Пад вечар сетку забяруць,
Схаваюць з рыбай у мяшок,
Ад рыбааховы ўцякуць –
Чужых хай ловяць на аброк.

На заўтра дружна будчакі
Каля маста збяруцца –
Да іх няўмекі-рыбакі
З усіх бакоў збягуцца.

Яны імгненна разбяруць
Улоў за грошы, пляшкі,
Дамоў адразу павязуць
Карпаў жывых і важкіх.

Хлапцы прысядуць ля ракі,
Учарашні жар "загасяць".
Жывуць някепска землякі
У Будчы, ля рыбгаса.

*Вас усіх я запрашаю*
*Пад гармонік танцаваць.*
*Хай ніхто не замінае*
*Нам прыпевачкі спяваць.*

У мужыкоў нашых загана:
Самагонку хвошчуць,
Сінія, бы баклажаны,
І жанок не “топчуць”.

Урачоў трэ  шкадаваць,
Бо ім плоцяць мала.
Едзьце ў вёску працаваць –
Будуць яйкі з салам.

Збудавалі нам дамы –
Чорт не пазайдросціць.
Ў іх, як жабы, мерзнем мы,
Летам  стынуць косці.

Быццам філін на суку,
Нехта стогне, вые,
Гэта зяцю–прымаку
Цешча шыю “мые”.

Каб зяць цешчу шанаваў,
Шараваў ёй пяткі,
Дык даўно б сабе прыдбаў
“Мэрс” ці хоць “дзевятку”.

Цесць з зяцьком гарэлку п’юць
З раніцы у хаце:

З першай чарачкі клянуць
Цешчу з яе маці…

С певакам чамусьці веру
Слёзы нават коцяцца,
А яны гоняць "фанеру"
Ім спяваць не хочацца.

Рот ледзь могуць раскрываць
Зоркі ганарлівыя,
Вось каб ім за гэта даць
Грошыкі фальшывыя.

Хай пабачаць, ці дадуць
За іх лусту хлеба.
Не дадуць дык запяюць
Без хлусні – як трэба.

# На празаічнай сцежцы

# Душой зрадніўся з вёскай Начай

Прайшло больш за трыццаць гадоў, з таго часу калі  ўпершыню апынуўся ў вёсцы Нача. Тут гулялася наша вяселле з маёй прыгажуняй-паляшучкай Ларысай Аляшкевіч. Незнаёмая ціхая вёсачка адразу заваражыла мяне. Здзівіўся я і абрадаваўся, калі пачуў, як размаўлялі тут людзі. Мова беларуская - шчырая і пявучая - жыла ў той час у Начы. Яна амаль нічым не адрознівалася ад мовы майго дзяцінства, што прайшло на Гродзеншчыне.

Абдымала вёску і спявала ёй песні рачулка Начанка. Было ў ёй многа кляшнятых ракаў і безліч усялякай рыбы. Пашчасціла мне ў гэтай рэчцы лавіць асцярожных залацістых лінёў, жаўтавокіх дзівосных чырванапёрак і разважных мянтузоў. Луналі над вадою і адпачывалі ў чароце markdown рознакаляровыя стракозы. На беразе ў траве няспынна гаманілі паміж сабою конікі.

А колькі было ў вёсцы буслянак! Толькі над вясковымі могілкамі іх было каля дзесяці. Адсюль разам з бацькамі адлятаў  у далёкую Афрыку, таямнічую Турцыю маладняк.  Я ведаю, што буслы - начанцы дзяліліся навінамі са сваімі сябрамі з другіх краін і запрашалі іх на другі год ляцець з імі ў Божы край -Палессе.

Магчыма, і прылятаці сюды іх замежныя сябры, бо заўважыў я, што сярод нашых чакаватых і крыху святлейшых буслоў больш шляхетных і цыбацейшых...

Жыхары вёскі Нача - працавітыя, адкрытыя і шчырыя на размову. Колькі добрых парад і дапамогі атрымаў я ад дзеда будчака Міхаіла Юльянавіча Міхлюка, а таксама  Мікалая Пісарыка, Радзівона Свірыда, Валодзі Бурдзейкі... Ды хіба ж пераліча добрых людзей гэтай вёскі?

Ніколі і нідзе я не каштаваў такой духавітай і смачнай вяндліны, як у Начы. Не магу забыць ідовішча паляндвіц, кумпякоў, каўбас, кавалкаў сала, якія віселі вясной пад стрэхамі амаль у кожнага гаспадара. Заможна жылі Начанцы. Будавалі новыя хаты, жанілі дзяцей, хрысцілі ўнукаў. А які давер быў

паміж людзьмі! Адыходзячы з хаты, накідвалі толькі клямку і прышчаплялі яе трэсачкай. Не кралі ў недалёкі той час, бо гэта лічылася вялікім грахом: не было жыцця злодзею сярод сумленных вяскоўцаў.

Каля вёскі шумеў меднастволы бор, багаты на грыбы і ягады. За вёскай расла і ляшчына, з якой каштаваў я поўныя смачныя гарэхі.

На ўсё жыццё толькі добрыя ўспаміны засталіся аб пражытых у вёсцы дзяньках.

Час бяжыць няўмольна. Выраўнялі раку, і цяпер не магчыма зразумець, дзе закончылася Начанка і дзе далей цячэ Лань. Зарастае рэчка каля вёскі алешнікам і лазняком. Усялякімі прыладамі нішчаць рыбу вар'яты, не думаючы аб тым, што яны пакінуць пасля сябе нашчадкам. Над вясковымі могілкамі засталася толькі адна буслянка. Хіляцца да зямлі асірацелыя хаты, дзічэюць ля іх сады. Адыходзяць, як і наканавана, з жыцця людзі. Сумна і роспачна, што ў новыя пабудаваныя бацькамі хаты не хочуць ехаць іх дзеці. Не хоча ён свой лёс звязваць з вёскай, дзе нарадзіўся. Відаць, страшыць іх сённяшняе жыццё сялян.

Ажывае вёска толькі летам, калі сюды прыязджаюць дзеці і ўнукі. Гучаць песні з магнітафонаў на замежнай і рускай мове. Па-беларуску чамусьці моладзь саромееца размаўляць. Мала засталося людзей, якія яшчэ працуюць на зямлі і кормяць нас, гараджан. Нізка кланяюся ім і прысвячаю гэтыя радкі:

*Сустрэнеш у полі іх, сустрэнеш на лузе:*
*Працуюць ад сэрца, як трэба.*
*Вам дзякуй, вясковыя шчырыя людзі,*
*За кожны кавалачак хлеба.*

Я так хачу, каб не знікла цяпер ужо родная мая вёсачка Нача. Дай памажы ёй Божа.

# Браты, знікае мова!

*І ўсё мілагучна для сэрца майго:*
*і звонкае "дзе", і густое "чаго"...*
Пімен Панчанка

"Нацыя - гэта супольнасць людзей, якаа склалася гітарычна на базе агульнасці мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця і псіхалагічнага складу, які праяўляецца ў агульнай культуры" (БСЭ). Як бачна з прыведзенай цытаты, адным з асноўных падмуркаў нацыі з'яўляецца мова. І нас, беларусаў, павінна яднаць менавіта яна.

На жаль, родная мова паступова знікае. Мова, пра якую Францішак Багушэвіч ў прадмове да"Дудкі беларускай"пісаў: “Братцы мілыя, дзеці Зямлі – маткі маёй! Вам, ахвяруючы працу сваю, мушу з вамі пагавеарыць аб нашай бацькавай спрадвечнай мове. Мова наша ёсць такая панская як іфранцузская альбо нямецкая. Харваты, чэхі, маларосы і другія пабрацімцы нашыя маюць па - свойму пісаныя і друкаваныя кніжачкі. І дзеткі іхнія чытаюць так, як і гаворацы. Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная... Шмат было такіх народаў, што страцілі мову сваю, так, як той чалавек, перад скананнем катораму мову займе, а потым і зусім ўмерлі".

Гэтыя радкі напісаны больш за сто гадоў назад, а лёс роднай моеы і сёння па - ранейшаму хвалюе тых, каму неабыякава будучыня Радзімы. Адзін з іх, прафесар мовазнаўства Павел Сняцько сцвярджае: “Без роднага слова, якое выяўляе культуру, гісторыю народа, народа проста не можа быць!”

А ці многія з нас, беларусаў задумваюцца нцад тым, чаму знікае наша мова на тэлебачанні, чаму так мала беларускамоўных газет і часопісаў? Нават кніжку на роднай мове цяжко знайсці ў кнігарнях. На тэлебачанні, на прыклад, ад некалькі папулярных перадач засталіся адны толькі беларускамоўныя назвы, а самі яны гучаць на рускай мове. Не пачуць роднага слова і ў дзяржаўных установах.

Сёння здарылася так, што ў нашай краіне размаўляюць па-беларуску самыя высокаадукаваныя людзі: у акадэміі навук, ва ўніверсітэтах, бібліятэках, музеях ды архівах, рэдка у сярэдніх школах…

Адной з крынічак, якая яшчэ журчыць, засталося беларускае радыё. Мілагучную, яскравую матчыну мову даносяць да нас вядучыя “Радыёфакта” Андрэй Мохар, Святлана Лук’янчык і іншыя. Але мне вельмі шкада іх, калі ў дыялозе с суразмоўцамі яны павінны пераходзіць на рускую мову, бо запрошаныя ў эфір на іх беларускія пытанні чамусьці адказваюць па - руску.

На гэтым фоне мне вельмі прыемна чуць, як на тым жа радыі кожную суботу каталіцкія свяшчэннікі вядуць імшу на беларускай мове. І хаця я не католік, з задавальненнем слухаю гэтыя перадачы. Вось у каго нам трэба павучыцца адносінам да мювы народа той краіны, у якой жывеш!

З нядаўняга часу на беларускім тэлебачанні пачалі паказваць цудоўную праграму "Спявай, душа!", якую вядзе Валянціна Карэлікава. Але час для яе выбраны няўдала. Хто ж яе будзе глядзецьу 7гадзін 35 хвілін раніцы, калі большасціз нас трзба спяшацца на работу?

З газет, радыё, тэлебачання можна даведацца пра наступальны і актыўны характар нашай ідэалогіі, часта чуць словы "бяспека": харчовая, эканамічная, сацыяльная і г.д. А вось пра бяспеку знікнення нашай мовы, неад'емнай часткі любой нацыі, амаль ні слова! Шкада…

Беларусь - гэта краіна, дзе побач мірна жывуць людзі розных нацыянальнасцей і рэлігійных канфесій. Існуюць школы, дзе выкладаюць на польскай і літоўскай мовах ( на Гродзеншчыне) і нават на і ўрыце (у Мінску). Чаму ж тады мы ў сябе дома, забываем і ганьбім родную мову?

Мне давадзілася сустракацца з палякамі, чэхамі, славакамі, сербамі, балгарамі і мы добра разумелі адзін аднаго, калі я размаўляў з імі па-беларуску. І не дзіўна, бо мы народы і нацыі адных каранёў - славянскіх... Туга агортвае сэрца, калі ўяўляю, што да маладога беларуса звернуцца сябры з суседніх краін і папросяць яго заспяваць беларускую песню, расказаць пра нацыянальную спадчыну. Наўрад ці хто здолее выканаць гэтую просьбу.

Дык ці не Іваны мы бязродныя? І ўсё ж не! Многія нашы суайчыннікі ўславілі свет, абагацілі культуру шмат якіх краін і сталі там ледзь не нацыянальнымі героямі. У якасці прыкладу прывяду толькі некалькі прозвішчаў.

Францішак Скарына (1496- І550г.г.) - увайшоў у гісторыю як славуты беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар.

Сімяон Полацкі (І629-І680 г.г.) - беларускі і расійскі пісьменнІк, заснавальнік тэатра ў Маскве.

Ігнат Дамейка(1801-І889 г.г.) - прафесар, рэктар Сант'ягскага ўніверсітэта, нацыянальны герой Чылі.

Бенедыкт Дубоўскі - першы даследнік Байкала.

Канстанцін Ельскі - даследнік Гвіяны і Перу.

Міхаіл Судзілоўскі - першы прэзідэнт Гавайскіх астравоў.

Г. А. Вількіцкі - першаадкрывальнік Паўночнай зямлі.

Гіём Аплінэр - вялікі французскі паэт, таксама наш зямляк.

Яшчэ трэба ведаць, што ў 1650- 1670 гады - кожны пяты жыхар Масквы быў беларусам, таму няеарта здзіўляцца, што і да гэтага часу масквічы "акаюць".

Так што мы усе  маем права ганарыцца нашымі славутымі землякамі -былымі і сённяшнімі, урэшце, тым, што мы - беларусы? Маем, але для гэтага трэба выканаць адну абавязковую ўмову: не страціць мову. Яна, мова, самая святая пасля веры.

Закончыць свае нататкі мне хочацца словамі знакамітай паэтэссы Ларысы Геніюш, з якой мне пашчасціла жыць побач і супрацоўнічаць:

*Матчынай мовы, багатай і слаўнай,*
*Што ў скарбах народа, бы фонд залаты,*
*Не аддавайце бяздумна, бяспраўна,*
*Не прадавайце святога, браты!*

# Гонар маю!

Не магу змаўчаць, калі зневажаюць армію. Вось і на гэты раз паспрачаўся з маладым чалавекам. Ён запыніў мяне і спытаў: чаму не пішаш вершаў пра дзедаўшчыну ў беларускім войску і хабарніцтва? Я ж пацікавіўся, ў якіх войсках ён служыў. Аднак акрамя зняважных слоў пра армію нічога ад яго не пачуў. Адразу падумалася, што гэты малады чалавек ніколі і нідзе не служыў. Маю здагадку падцвердзіла незнаёмая мне жанчына, якая стала міжволнай сведкай нашай размовы: “Не служыў. Я яго добра ведаю”.

Зашчымела сэрца няўжо гэта так? І прыгадалася гісторыя трохгадовай даўнасці. З Люсіна да Баранавіч мне давялося дабірацца на спадарожнай ваеннай машыне “Газ-66”. У кузаве грузавіка сядзеў малады баец. Пакрысе разгаварыліся. Нехаваючы абурэння, салдацік расказаў мне аб паводзінах особных афіцэраў і хабарніцтве, аб здзеках “дзядоў” над “салагамі”.

Я слухаў салдата і мне было сорамна прызнацца яму, што сам афіцэр дваццаць пяць гадоў праслужыў ў ракетных войсках стратэгічнага прызначэння, што праз мае рукі прайшлі тысячы людзей. Але за ўвесь гэты час я не страчаў ні офіцэраў - хабарнікаў, ні крымінал – дзядоў. Афіцэры годна неслі свой гонар, салдаты пачэсна выконвалі войскі абавязак.

Прыгадваючы 90-я гады, калі я камандаваў ракетным дывізіёнам. Пад маім кіраўніцтвам служылі салдаты 19 нацыянальнасцей. Ні аб якой дзедаўшчыне размовы нават не вялося. І сёння добрым словам ўспамінаю маіх падначаленых: узбека Маюсупова, тувінца Кечы - Оола, грузіна Ламідзе, азербайджанца Аліеea (роднага пляменніка былога прэзідэнта Азербайджана Гейдара Аліева), татарына Шарыфуліна, рускага Мішу Сірату, беларуса з - пад Міру Гену Генака... Ды хіба ж усіх згадаеш цяпер? Гэта былі цудоўныя салдаты, якія жылі адной дружнай сямьёй, нягледзячы на розныя нацыянальныя карані. Моцная дружба, згуртаванасць дазвалялі ім выконваць самыя складаныя задачы. Як тады, ў І985 годзе, калі дывізіён абараняў гонар ракетных войскаў СССР на паказальных стрэльбах. Мы прама з марша правялі пускі ракет, і яны ўсе, як адна, трапілі ў цэль. Аб нашым поспеху пісала “Красная звезда” - галоўная газета Ўзброеных Сіл Саюза.

Калі б сёння я сустрэўся са сваімі салдатамі і афіцэрамі, мы б абавязкова абняліся і расцалаваліся. А зараз!... Ніяк не магу зразумець, што дзеляць між сабой салдаты адной нацыянальнасці - беларусы?! Аб якой дзедаўшчыне можна весьці гаворку, калі сёння любы паважаючы сябе салдат мае магчымасць пасля дэмабілізацыі прыехаць з сябрамі дамоў да гэтага “дзеда” і пагаварыць з ім па- мужчынску!

Думаю, сваіх дзядоў павінны ведаць ўсе. Пра іх подзвігі не шкодзіла б час ад часу паведамляць у раённай газеце, каб бацькам было сорамна за сваіх нашчадкаў. Упэўнены, жадаючых засвяціцца з гэтага боку істотна паменьшылася б. Галоснасць - дысцыплінуе, а не кампраметуе.

А калі гаварыць наогул, то у нас цудоўныя баявыя і патрыятычныя традыцыі, на аснове якіх і трэба выхоўваць абаронцаў Айчыны - сёняшніх і будучых. Трэба зрабіць армію такой, каб ёю можна было ганарыцца, каб служыць ў ёй было - пачэсна. А каб раз і назаўсёды выкараніць дзедаўшчьну, раю будучым салдатам загадзя рыхтавацца да службы і прыходзіць ў яе фізічна моцнымі і  з загартаванай воляй.

Асобная размова - пра афіцэрскі гонар. Некаторым афіцэрам, на жаль, трэба вучыцца не толькі прышываць, але і насіць пагоны з гонарам. Зараз на экранах тэлевізараў ды і на вуліцы можна ўбачыць афіцэраў, неахайна апранутых, з залішняй вагой, і што яшчэ горш, якія не даражаць афіцэрскім гонарам і становяцца на шлях службовых злачынстваў.

У мой час служыць было значна цяжэй. Кожная новая зорачка на пагонах, кожнае павышэнне на службе давалася нялёгка. Каб заслужыць гэта, трэба было быць лепшым з лепшых. І ўсё ж многія дастойныя ў сілу розных акалічнасцей не сталі старшымі офіцэрамі. Мне здаецца што ў Ганцавічах служыць куды лягчэй, чым ў далёкіх сібірскіх гарнізонах. Таму я моцна абураны тым, што здарылася нядаўна ў раённым ваенкамаце - хабарніцтвам заплямлены афіцэрскі мундзір. З гэтага вынікае, што цяперашнім афіцэрам трэба яшчэ шмат вучыцца ў сваіх папярэднікаў, каб быць хоць крыху падобнымі на іх.

Аднойчы І. Сталін спытаў у былога царскага афіцэра, начальніка Узброеных сіл СССР Б. Шапашнікаеа (дарэчы, толькі да яго правадыр звяртаўся не інакш, як называючы па імю і імю па бацьку), чаму ён строга не карае афіцэраў. Сівы маршал адказаў: ў царскім войску, калі афіцэр атрымліваў вымову, ён сам падаваў у адстаўку, каб не пляміць гонар мундзіра. Задумайцеся над гэтым, паны афіцэры!

# Незнаёмка

Каля пятнаццаці гадоў прайшло з таго часу, як мы першы раз сустрэліся. У першую хвіліну нашага знаёмства быццам маланка прайшла праз маё сэрца. Я стаяў заварожаны і не мог адарваць свой позірк ад гэтай прыгажуні. Такога дзіўнага хараства мне ніколі не даводзілася бачыць ў сваім жыцці.

Была ранняя вясна. Празрыстая зялёная сукенка спрытна абдымала яе стан. Нічога лішняга, фанабэрыстага не было ў яе аддзенні. Відаць, яна мела добры густ і ведала, што ёй больш падыходзіць да твару.

Убачыўшы мяне, незнаёмка чамусьці разгубілася і, як падалося мне, засарамацілася, задрыжала і бездапаможна апусціла рукі. Спыніўшыся не больш як на хвіліну, я пакрочыў далей.

Амаль праз некалькі дзён мне зноў захацелася ўбачыць яе. Не вытрымаўшы доўгага чакання, быццам юнак, я пабег да месца нашай першай сустрэчы. Трапятала сэрца. Мучыла думка: “Ці пазнае яна мяне?” Пазнала.... У яе вачах не было ніякага здзіўлення. Не ведаю, чаму, але мой маналог пачаўся адразу. Ад яе не ўтаіў нічога: што ў мяне ёсць сямья і дзеці, што пашчасціла дачакацца званочкаў - ўнукаў... Яна ўмела слухаць. На гэты раз мы былі разам доўга. Стала так міла на сэрцы; я быў так ўдзячны ёй за тое, што яна моўчкі і ўчасліва слухала маю споведзь. У канцы сустрэчы на маі “Пакуль!” прыгажуня ветліва і шчыра памахала мне ўслед.

Бачыліся мы не часта. Асабліва прыгожай мая знаёмая станавілася восенню. Мне здаецца, не знойдзецца такі мастак у свеце, які змог бы пэндзлем намаляваць яе залатыя, бліскучыя валасы. Колер у іх быў ад жоўтага да агністага. Нават словамі я не магу перадаць гэту дзівоснасць, гэту незямную прыгажосць. Не ведаю чаму, восенню мая прыгажуня пачынала сумаваць. Сум у яе быў чысты і лёгкі. Аб чым яна думала ў той час, яна ніколі мне не казала. Разам з ёю пачынаў сумаваць і я, бо ведаў, што у мяне не будзе магчымасці бачыць яе зімою.

Усю зіму, асабліва вечарамі, не давалі мне спакою думкі: “Як яна там? Ці не пакрыўдзілі яе?Т Не зрабілі ёй балюча?” Ведаю, што жыццё і адзінота навучылі маю знаёмую цярпець сцюжу і навалы шалёнай завірухі… Так хочацца дачакацца таго часу, калі будуць усё разумець мае ўнукі. Разам з імі і моёй жонкай мы абавязкова пойдзем да яе - маёй прыгажуні - бярозы, якая стаіць на ўскрайку леса - за выміраючай невялічкай вёскай Ясянец…

# Людзі-суседзі

Перасяленцы... Не падабаецца мне гэтае слова. Здаецца, не так варта называць тых людзей, якіх вымусіла назаўжды пакінуць свае родныя мясціны і пераехаць у розныя куточкі краіны чарнобыльская бяда.

Калькі асела іх на Ганцаўшчыне! Іх многа і ў нашым доме. У адным пад'ездзе жывуць Ю. І. Драбышэўская, Н.С. Скараход, М. Р. Анацко. Розныя яны па рафессіі, па характару, у кожнага - свой лёс, сваё жыццё. Але аб'ядноўвае ўсіх іх адно - туга па пакінутых хатах, родных дварах, дзе яны помняць кожную штыкецінку ў сваім плоце. Сумуюць яны па родных мясцінах, запаветных куточках. Туды іх да гэтага часу нясуць успаміны - думкі, бо многія з іх самыя шчаслівыя хвіліны свайго жыцця спазналі іменна там. Там яны першы раз сустрэлі сваё каханне, злучылі лёсы, нарадзілі дзетак. А цяпер...

Цяпер яны - рэдкія госці. Жывуць у чаканні Радуніцы. У гэты дзень яны абавязкова ляцаць, нібы птушкі, на радзіму, на магілы сваіх бацькоў, сваіх прашчураў. Ляцяць на спатканне з роднымі вытокамі.

Сумна.... але трэба жыць. І яны ўжо сталі ў нас сівымі. Так і хочацца назваць іх землякамі. Хто яны - нашы людзі - суседзі?

Жыве побач з намі Юлія Іванаўна Драбышэўская. Цяжкі лёс напаткаў гэтую жанчыну. Перажыла вайну. Незагоеную рану пакінула суровае дзяцінства: засталася сіратой. Даў Бог сустрэць добрага чалавека, з якім пражыла доўгае жыццё. ВыгадавалІ траіх дзяцей. Разляцеліся па свеце, стаўшы на ногі, родныя крывіначкі. Сын Мікалай жыве зараз у Санкт-Пецербургу. Адна з дачок - ў Салігорску, другая - ў Баранавічах. ДзецІ часта наведваюць матулю, бо апошнім часам пагоршылася здароўе дарагога ім чалавека. Пра Юлію Іванаўну, яе жыццё можна напісаць цікавую кнігу.

Ніна Сяргееўна Скараход. Мужная жанчына. Адна выгадавала двух сыноў - Дзіму і Сяргея. Якія ў яе залатыя рукі! Яна можа звязаць ўсё: сурвэтку, абрус, сукенку. І не абы-як! Хто ні ўбачыць яе вырабы, зробленыя кручком,- і захапляюцца: няўжо такія рэчы - спнрава чалавечых рук?

Марыя Рыгораўна Анацко. Жыхары дома клічуць яе па- свойску, проста - Рыгораўна. Жанчыне ўжо больш за 80 гадоў. Яна звычайна сустракае і праводзіць нас, седзячы на лаўцы каля пад'езда. Калі дрэннае надвор'е, чакае суседзяў на ў услончыку, але ўжо на ганку. Калі няма на сваім звычайным месцы Рыгораўны, усе турбуюцца, ці не здарылася што з ею.

Цікава пагаварыць з гэтай жанчынай. Сумуе яна па сваёй радзіме, па тых краявідах, што назаўжды застоліся ў яе памяці і вярэдзяць сэрца. Рыгораўну часта наведваюць унукі. Ласуюцца яе просценькімі гасцінцамі, частуюць і яе. Калі назіраеш за імі, дык неяк не зразумець, хто з іх больш шкадуе адно другога. Мяне вельмі здзіўляе, што яна ведае ўсё і пра ўсё.

Я вельмі люблю вітаць Рыгораўну. На маё прывітанне яна заўседы адказвае: “Добрага вам здараўя!” І адразу становіцца на душы святлей, паднімаецца настрой і здаецца, што сапраўды палепшала здароўе - такое шчыряе прывітанне - пажаданне ад Рыгораўны. Добры ў яе гумяр - трапны, добразычлівы. Мне вельмі хочацца зазірнуць ў яе маладосць. Уявіць, якой яна была дзяўчынай. Ведяго адно: прыгожай.

Цудоўныя людіі жывуць на першым паверсе – Анатоль і Вера Рагозіны. Працавітыя самі, руплівыя і іх дзеці. Цяжкай працай дастаюцца “лёгкія грошы” Анатоля. Вымушаны ён працаваць за межамі нашай краіны, бо клапоціцца аб тым, каб дапамагчы ўладкавацца сваім дзецям - Марыне, Сяргею і Сашы.

Ветлівая і руплівая гаспадыня Вера. Вельмі часта смачны пах яе плыве з яе кватэры. Хай выбачае мяне Вера ,яле ж я, нібы малое дзіця,заўсёды шукаю якую-небудзь прычыну, каб ў гэты час завітаць да іх. Смачныя ў яе пірагі, пячэнне, аладкі. А кашы з гарбузоў - такое духмянае і салодкае - мо нідзе на свеце няма. Пад гэтыя стравы добра ідзе “фірменны” напітак, якім заўсёды пачастуе Анатоль. Дзякуй вам, добрыя людзі! Багацця, дабра і шчасця ў вашу хату!

У суседнім пад 'ездзе, на розных паверхах жывуць гамяльчане. Я, на жаль, не ведаю прозвішчы ўсіх іх. А вось Лілію МІхайлаўну Вадзюціну мала хто ў горадзе и ўвогул на Гамнаўшчыне не ведае. Як хораша яна іграе на баяне і гармоніку! Здаецца, няма той мелодыі, якую б не найграла Ліля Міхайлаўна. Мабыць, ніводзін канцэрт, які даюць дарослыя ці дзеці, не абыходзіцца без яе музычнага суправаджэння. Падбірае ўдалую музыку да вершаваных радкоў сама. І спявае хораша ЛІлія Міхайлаўна. А які цудоўны голас ў яе дачкі Алы! Рэдка ў каго не пакоціцца сляза на твары, калі яна выконвае песні - чуллівыя, чароўныя.

А бачылі б вы, як цікава сустракаюць святы нашы гамяльчане. Якія меладычныя, кранаючыя сэрца песні гучаць ня беларускай і украінскай мовах, калі яны разам збраюцца за адным сталом, што накрываюць у двары ля пад'езда. Мне здаецца, што гэтыя песні далятаюць адсюль, з Ганцаўшчыны, да іх пакінутых хат, палёў, садоў, лясоў і там распряўляюць

крылы і доўга яшчэ лунаюць над роднымі абшарамі. Нашы суседзі заўседы запрашаюць усіх прысесці побач і раздзяліць з імі ў гэты час іх радасць і сум. Цудоўныя людзі! На жаль, не магу напісаць пра ўсіх жыхароў, якіх чарнобыльская бяда прывяла на Ганцаўшчыну. Але ад усіх насхачу пажадаць ім, каб наша добрая блакітнавокая старонка стала для іх другой Радзімай. Каб ніколі бяда не зрывала іх з абжытых гнёздаў. Не сумуйце, а моладзь хай нараджае нам новых Ганцаўчан.

# Шыльды нашага горада

Не ведаю, як іншым, а мне ў апошні час ўсё больш становіцца крыўдна за нас, беларусаў, за абыякавыя адносіны да нашай роднай мовы. Калі уважліва прачытаць аб’яеы ці тое, што напісана на шыльдах нашых крам, становіцца сорамна: відаць, тыя, хто замаўляў шыльду, і тыя, хто іх рабіў, не сябруюць з беларускай мовай. Нават насупраць ГДК - установы, якая павінна быць носьбітам нашай беларускай культуры, шанаваць і прадаўжаць традыцыіі беларусаў, нядоўна вісела аб'яеа “Кастинг в ансамбль барабаншиц. Приглашаются девушки 13-15 лет.”. Мне здаецца, што многія жыхары нашага горада не ведаюць нават сэнсу гэтага слова “кастинг”. У тлумачальным слоўніку Ожэгава такога слова няма, ёсць толькі слова “каста”- абасобленая грамадская група. Далей ідзе слова “кастрацыя”- гэта медыцынскі тэрмін. Чалавек, які не ведае слова кастынг, напэўна, не пусціў бы сваё дзіця на такое мерапрыемства, бо невядома, што там з ім будуць рабіць. Ці не прасцей было б напісаць, што праводзіцца конкурс.

На мой погляд, назвы на шыльдах, акрамя часцінкі культуры, павінны несці сэнс. Зробім невялікую экскурсію па гораду. Аб чым гавораць назвы “Фортуна”, “Ностальгия”, “Домовой”, “Венеция” і г.д.? Настальгія азначае сум па радзіме(С.ОЖЭГАЎ). Многія нашы суайчыннікі, якія апынуліся далёка ад сваёй радзімы, шчыра сумуюць па бацькаўшчыне, па сваіх родных мясцінах, па мілагучнай мове. Аб чым сумуюць сёння наведвальнікі кафе “Ностальгия”? Ці то агортвае сум за кілішкам гарэлкі жанчын, чые мужыкі падаліся ў заробкі, ці то настальгія аб нечым добрым і сеетлым?

Я разумею назву “Фортуна”, бо, калі пашанцуе, дык купіш тое, што трэба. А не - дык ідзі шукаць далей - у краме “Домовой”, дзе вас сустрэнуць ветлівыя гаспадары, і людзі часцей заўсё задаволеныя, вяртаюцца з пакупкамі, якія так неабходны, каб налепшыць інтэр'ер хаты. А няўжо назва па-беларуску гучала б горш? Напрыклад, “Для вашай хаты”. Людзі ішлі б ў краму не з меншым задавальненнем і нават прыезджыя адразу па назве маглі б здагадацца, што там прадаюць.

Неблагі магазін “Радуга”, які не так даўно адкрыўся каля чыгуначнага вакзала, але, на мой погляд, “Вясёлка” гучала б значна прыгажэй. Гэта сонечна - каляровая назва адразу прыцягвала б пакупнікоў сваёй цеплынёй.

Ці не цудоўна назвалі кафэ “Буслік”? Светлае, прыгожае слова, якое прыйшло да нас з даўніх часоў, і нашы продкі захавалі і данеслі яго нашым і наступным пакаленням.Калі пацяплее, абавязкова завітаю ў гэта кафэ са

сваімі ўнукамі. Мне здаецца, што праз гады яны ўспомняць не “Макдональдс”, а менавіты назву “Буслік”, дзе ласаваліся разам з дзедам.

Разважаць на гэты конт можна шмат. Хацелася б звярнуць увагу і тых адказных асобаў кіраўніцтва раёна, якія зацверджаюць назвы новых крам і павільёнаў, каб яны ставіліся да гэтага з большай адказнасцю і не забывалі, што мы беларусы. Тым больш, што зараз па тэлебачанні, радыё амаль кожны дзень ідзе рэклама: “Купляйце беларускае”! А чаму мы да гэтага часу збоку? Ці ў нашым раёне ўжо перавяліся патрыёты сваіх краіны, свайго горада?

# Ён побач і не рвецца ў вырай...

Дзівосныя істоты птушкі. Без іх было б сумным жыццё на зямлі. Радасна бачыць вясной ланцужкі стомленых птушак, што вяртаюцца дамоў з далёкіх краёў. Так і хочацца распытаць іх пра жыццё ў заморскіх краінах. У весну кожны з нас спяшаецца паведаміць сваім блізкім ці знаёмым, што ён першы ўбачыў прыляцеўшых з выраю шпакоў ці буслоў.

Я вельмі люблю шпакоў. Хвалююся, калі ўбачу іх вясной упершыню. Яны быццам бы дождж з хмары падаюць з неба на галінкі дрэў, на шпакоўні, садзяцца на стрэхі хат, на высокія тэлевізійныя антэны. Усе чорна-бліскучыя, з жоўтымі дзюбамі, яны адразу пачынаюць спяваць свае простыя, меладычныя песні, нібы гукаючы вясну. У маі прылятаюць да нас салаўі. Яны жывуць недалека ад майго дома,, за аўтавакзалам і ў густым кустоўі ля завода домабудавання.

Цікава паназіраць за птушкамі і летам. Вабіць, чаруе сваёю песняй жаўрук. У яго такі цудоўны і звонкі галасок. Калі пачуеш яго песню, хочацца легчы на дзірване каля жыта, закласці рукі за галаў і, заплюшчыўшы вочы, слухаць жаўрука бясконца і думаць аб нечым сваім, патаемным.

Самая сумная для мяне пара — восень. Тады птушкі зноў адлятаюць у вырай. І нібы пусцее без іх зямля. Здаецца, што хтосьці блізкі пайшоў з мае хаты, і надоўга...

У гэтую слотную пару птушкі аддаляюцца ад чалавечага жытла. І толькі ў лесе, у гушчары, ціўкаюць сініцы ды перастукваюцца паміж сабою дзятлы. Ім няма куды спяшацца, яны застаюцца зімаваць у родных краях. Часцей іншых увосень сустракаюцца крумкачы. Яны сядзяць высока на ялінах і сочаць за тым, што робіцца наўкола. Я заўжды вітаю іх. Цікаўлюся, колькі гадоў пражылі яны на свеце. Што бачылі за гэты час. Але птушкі маўчаць. Аднак я ведаю, што за свой доўгі век яны пабачылі нямала.

Вельмі цяжка птушкам, што ніколі не пакідаюць сваю радзіму, калі на зямлю выпадае снег, прыціскае мароз. Ім цяжка тады знайсці для сябе ежу. Я шкадую крылатых і заўсёды майструю для іх сталоўкі, кладу ў іх сякую - такую птушыную ежу. Аднак да маіх кармушак сталавацца прылятаюць чамусьці адны сініцы. Яны сілкуюцца па чарзе, саступаючы месца адно другому. Але і сярод іх ёсць “парушальнікі”. Мне здаецца, што гэта “мужчыны”. Яны нахабна адганяюць ад сталоўкі ўсіх птушак, пакуль не наядуцца самі.

Сярод сінічак з'явілася ў мяне сяброўка. Яна адрозніваецца ад астатніх хіба толькі тым, што на правым крыле ў яе менш пер'я. Калі яна падсілкуецца, то не адразу адлятае ад сталоўкі, а садзіцца паблізу і пазірае ў маё акно, з-за фіранак якога я назіраю за птушыным царствам. Перад адлётам яна абавязкова некалькі разоў ціўкне, нібы дзякуючы мне за пачастунак.

Калі я забываю пакласці ў кармушку ежу, птушкі пачынаюць хвалявацца, а найбольш смелыя з іх пачынаюць патрабавальна стукаць дзюбкамі ў шыбу майго акна, маўляў, не драмі, кармі нас. Паглядзіш на іх няхітрую мітусню, і на сэрцы становіцца лягчэй. Мне здаецца, што калі маёй душы будзе цяжка адлятаць на неба, яны дапамогуць ёй сваімі крыламі.

Зусім нядаўна каля Свята-Ціханаўскай царквы я ўбачыў снегіроў. Было іх усяго тры. Мала. Але, сустрэўшы іх, я нібы вярнуўся ў сваё бесклапотнае дзяцінства. У маіх успамінах яны і зараз быццам чырвоныя яблыкі, параскіданыя на бялюткім снезе ў бацькоўскім садзе.

Але найбольш астатніх птушак мне падабаюцца вераб'і. Яны вельмі падобныя на нас, беларусаў. Такія ж працавітыя, клапатлівыя, непрыкметныя. Гэтыя птушкі заўсёды трымаюцца людскога жытла. На жаль, у апошнія гады яны пачалі знікаць і ўжо занесены ў Чырвоную Кнігу Беларусі. Мне вельмі шкада іх, і я прысвяціў вераб'ям свой верш:

*Сярод птушак вялікіх і дробных*
*Клапатлівы жыве верабей*
*Мала з іх на каго ён падобны —*
*Так бывае і ў нас, у людзей.*
*Хоць і дзюбка ў яго малая,*
*Невялікія, кволыя крылы*
*Ежу сам ён сабе здабывае,*
*На свае спадзяваецца сілы.*
*У шпакоўні ўсю зіму зімуе,*
*А вясной праганяюць шпакі.*
*Калі дожджык сячэ, дні сумуе,*
*Пазірае з-пад чорнай   страхі.*
*Вельмі цяжка ў жыцці   вераб'ю*
*З яго добрай душою і шчырай.*
*Я шкадую яго і люблю,*
*Бо ён побач — не рвецца ў вырай…*

# Вандроўка ў Тураў

У сталым узросце кожнага чалавека цягне да спадчыны, гісторыі сваёй краіны, да каранёў далёкіх продкаў. Вось і я даўно хацеў пабачыць сваімі вачыма старажытны Тураў, прайсціся па незнаемых дагэтуль сцяжынках нашай мінуўшчыны. І аднойчы, кінуўшы ўсе нават самыя неадкладныя справы, я разам са сваімі роднымі рушыў у дарогу.

Усяго дзве з палавінай гадзіны хуткай язды — і нас сустракае невялічкі, а таму непрыкметны гарадок. Гледзячы на яго, не верылася, ўто яго гісторыя пачалася ажно з 980 года.

Перш-наперш мы накіраваліся да царквы Тураўскіх Усіх Святых - галоўнай тутэйшай знакамітасці. Драўляная, афарбаваная ў нябесна-блакітны колер, яна гасцінна прыняла нас. У храме адразу адчуваеш на сабе праніклівы позірк святых, якія глядзяць на цябе з пачарнелых ад часу абразоў. Зрабіўшы крок наперад, на імгненне здранцвеў перад двума каменнымі, быццам бы сякерай высечанымі, крыжамі. Пра іх існуе шмат легенд. Адна з іх апавядае аб тым, што ў далёкім XII стагоддзі крыжы прыплылі з Кіева ў Тураў па Дняпру і Прыпяці супраць плыні, даносячы да тутэйшага люду вестку аб перамозе хрысціянскай веры.

Трэці падобны крыж знаходзіцца зусім побач - па-суседству ў вёсцы Пагост. Я не стрымаўся і дакрануўся да аднаго з іх. Потым прыемная і невядомая мне дагэтуль цеплыня доўга саграваала мае далоні. І яшчэ я заўважыў, што велічная ўрачыстасць і звыклая зямная прастата жывуць у гэтай царкве побач. Яны, нібы мяккім крылом, агарнулі мяне, і ў сваіх думках я звярнуўся да Бога, просячы ў яго адпушчэння ўсіх зямных грахоў, молячы аб умацаванні свайго здароўя і маіх родных.

Перад пачаткам службы ў царкве, прысвечанай ушанаванню Рызы Гасподняй, да нас падышоў айцец Сергій. Даведаўшыся, што мы здалек, прапанаваў паспавядацца і прычасціцца. Бацюшка Сергій Храпавіцкі ўразіў нас «сваёй дабрынёй і спагадай, з вялікім жаданнем дапамагчы людзям. Яму хацелася даверыцца ва ўсім. Кожнае яго слова кранала за душу. Падрабязней пра яго лёс і добрыя справы я пазней даведаўся з артыкула ў газеце “Советская Белоруссия” “Будьте совершенны”.

Пасля службы ў царкве, крыху адпачыўшы, мы накіраваліся да Замкавай гары. Першае, што тут кінулася ў вочы, велічны помнік асветніку і паэту Святому Кірылу Тураўскаму. Яго творы, малітвы, напісаныя ў XII стагоддзі, і да гэтага часу непераўзыдзены ўзор прыгожага пісьменства.

Непадалек ад помніка вядуцца будаўнічыя работы. Плануецца ўзвесці штосьці накшталт саркафага, які дапаможа захаваць для нашчадкаў падмурак праваслаўнага храма, пабудаванага на гэтым месцы ў 70-ыя гады XII стагоддзя і парушанага землятрусам 3 мая 1230 года. Гэта была самая велічная пабудова на тэрыторыі заходніх зямель старажытнай Кіеўскай Русі. Уражваюць памеры падмурка: 29,3 метра ў даўжыню і 19,6 метра ў шырыню. Побач з гарою, дзе раней стаяў Храм, цячэ прыгажуня - Прыпяць. Маё сэрца не раз трапятала ад замілавання ўбачаных краявідаў зямлі Тураўскай.

Вандроўка па ваколіцах Турава прывяла нас на Барыса-Глебскія могілкі. Па насыпанай сцяжынцы падняліся наверх да самай цудадзейнай рэліквіі тутэйшых мясцін — Крыжа, які расце прама з зямлі. Перад ім ляжыць невялічкі дыванок, на якім людзі кленчаць і моляцца. Вядома некалькі выпадкаў, калі хворыя, дакрануўшыся да Крыжа, вылечваліся, нямоглыя хадзіць станавіліся на ногі. Цудадзейная сіла Крыжа вабіць да сябе шматлікіх паломнікаў з усяе Беларусі і з-за яе межаў. Аднак самі могілкі, у параўнані з ганцавіцкімі, уразілі мяне сваёй недагледжанасцю. Хіба ж можна так ставіцца да нашых святынь! Дарога дамоў падалася намнога карацейшай, бо ўсе былі задаволены гэтай ван дроўкай. Нават твары маіх родных пасвятлелі і памаладзелі. Праз некаторы час я зайшоў у нашу раенную бібліятэку імя В.Ф. Праскурава і з матэрыялаў, што маюцца там, яшчэ болей даведаўся пра вірлівае жыццё тагачаснага Тураўскага княства, пра дзейнасць вялікага асветніка Кірылы Тураўскага і цвёрда ўпэўнены ў тым, што кожны з нас павінен ганарыцца гераічнай, непаўторнай і, у некаторай ступені, трагічнай гісторыяй нашай Радзімы - Беларусі. А да моладзі я звяртаюся словамі беларускай паэтэсы Ларысы Геніюш:

*Агнем палымяным трэ край свой кахаць,*
*Трэ вырасці з ніваў, загонаў,*
*Каб славу, багацце - усё кінуць, аддаць*
*За кліч свайго роднага звона.*

# Любая назва - гэта помнік зямлі

Здаўна народ называў свае паселішча словамі, узятымі з жыцця. Для нашых непісьменных продкаў было найважней, каб слова было праўдзівым. Таму захаваліся да нашага часу вескі, рэкі, мясціны з непрыгожымі, на цяперашні погляд, назвамі— Забалоцце, Пусты Вугал, Яма, Чорная Гразь і іншыя. Лічыцца, чым больш старая назва населеннага пункта, тым яна найдаражэйшая.

Многа на Беларусі гарадоў, пра якія народ захаваў легенды. Некалі на месцы нашага горада Ганцавічы былі балоты. У той час князі, якія жылі на нашай зямлі і на суседніх, часта варагавалі паміж сабою. Аднак адзін з такіх князёў пайшоў паходам на Літву (так называлася некалі наша зямля), і большасць мясцовых жыхароў яго войскам была знішчана ці ўзята ў палон. Хто застаўся ў жывых, пасяліўся на выселках і ўзвышшах, забіўшыся ў глухія балоты. З часам яны сабраліся на вялікім востраве, дзе мужчыны дамовіліся змагацца з захопнікамі. Першую бойку з ворагам яны пад кіраўніцтвам свайго атамана Мітрыка правялі ў Хатынічах, і вельмі ўдала.

З таго часу недалёка ад Хатыніч, стала існаваць застава, «якую нельга было абысці». Калі чужынцы пасылалі сваіх ганцоў з данясеннямі, тыя траплялі ў рукі мужыкоў, якія вешалі іх на дубе. Панавалі прышэльцы не доўга, яны былі вымушаны ўцякаць з нашай зямлі. На месцы, дзе была заснавана застава, пачалі сяліцца людзі, і месца гэта стала называцца Ганцэвічы, сучасная назва яго Ганцавічы.

Хатынічы. Дзе зараз стаіць вёска, некалі былі страшныя балоты. Шлях да вёскі быў зімою, калі мароз замарожваў балоціны. Многія людзі хадзілі лавіць рыбу, касіць сена па натоптаных і вядомых сцежках, вярталіся дамоў заўседы мокрымі па шыю. Але знайшоўся сярод іх кемлівы хлопец Пятрок. Ен з лёгкіх і гібкіх лазовых галінак зрабіў сабе прыстасаванне на ногі, дзякуючы якому ён не правальваўся. Гэты “абутак” вяскоўцы назвалі хатулі, ці хатылі. Вёска ж атрымала назву Хотулічы або Хатынічы.

Нача. Гэта назва вёскі пайшла ад слова “нача” (пачатак), а пазней так пачалі называць і рэчку. Першыя людзі, якія перасяліліся ў гэтае месца, разгубіліся, бо яны раней не бачылі такіх балот і кустоў. Але ж, як у народзе кажуць: “вочы страшацца, а рукі робяць”. Памаліўшыся, прышэльцы дружна пачалі карчаваць кусты і асушваць вялікі кавалак балота. Хутка ачышчанае ад кустоў поле падсохла, земляробы пасеялі на ім жыта. Калі падышла пара жаць, выбралі жнейку-зачынальніцу з лёгкай рукой. Яна нажала жыта,

перавязала яго і паставіла першы снапок. Убачыўшы гэта, людзі загулі: “нач спавіла” Вось ён - нач, першы сноп у полі.

Чуў я ад старых людзей, што назва Нача мае другое паходжанне. Раней, калі людзі ў далёкія падарожжы ездзілі на вазах, яны на ноч спыняліся ў месцы, дзе зараз стаіць вёска. Часцей за ўсе падарожнікі ехалі некалькімі фурманкамі і перад тым як спыніцца на начлег, яны папярэджвалі другіх словамі: “На-нач, на-нач”.

Люсіна. Назва гэтай вескі пайшла ад імя дзяўчыны, якая не згадзілася пайсці замуж за пана Яшука, бо ён вельмі здзекаваўся над простым людам. Калі панскія лакеі вялі Люсю сілаю да пана, яна вырвалася ад іх, кінулася ў раку і ўтапілася.

Любашава, У цяперашняй вёсцы Любашава некалі жылі мужык ды жонка, звалі іх Любаш і Люба. Любаш зрабіў вялікі грэх - забіў купца на дарозе. За нарабаваныя грошы Любаш купіў сабе многа зямлі, наняў парабкаў і застаўляў іх працаваць з раніцы да вечара. Але на зямлі грэшніка чамусьці пачалі расці крушні з камянёў, якія заглушылі ўсё навокал. Нечакана Любаш захварэў і памёр. Пасля смерці Любы каменні раптоўна зніклі. Месца гэта назвалі Любашава.

Буды. Назва вескі, якая суседнічае з нашым раёнам, пайшла ад слова “буда”. Да таго словамі “буда” і “будка” называлі прадпрыемствы для смалакурні, гонкі дзегцю, службова-жылое памяшканне чыгуначніка, стрэлачніка.

Агарэвічы. У даўнія часы жыў у гэтай весцы Марка-пастух, які кожны дзень марыў стаць багатым. Яго зайздрасць і сквапнасць давяла да таго, што ён сваімі хаўруснікамі пачаў забіваць людзей і забіраць у іх каштоўнае. Неяк пачулі сяляне, што нехта забіў багатую пані, якая жыла ў іхняй вёсцы. Пошукі пані нічога не далі. У пакоях усё было паравернута, усе яе каштоўнасці зніклі. Марк жа са сваімі сябрамі пасля гэтага вьпадку не вылазіў з карчмы.

Неўзабаве ў вёсцы паявіўся сляпы жабрак з павадыром, які паведаміў, што раніцай скажа людзям, хто здзейсніў гэтае забойства. Яшчэ ён казаў, што вяскоўцаў чакае вялікае гора. На світанні жабрака знайшлі з перарэзаным горлам, а яго павадыр вісеў на суку дуба. У той дзень вёска нечакана згарэла ад маланкі, упаўшай з чыстага неба. Нічога са сваёй маёмасці нікому не ўдалося ўратаваць. Згарэў і Марк са сваімі сябрамі. Сваё селішча людзі аднеслі ад таго праклятага месца. Каб атрымаць дараванне ад Бога, ля дуба, пабудавалі царкву, а назвалі Пагарэвічы, цяпер яна Агарэвічы. Кожны чалавек павінен даведацца  пра свой радавод, пра свой край. Я веру, што з

часам у нашых Ганцавічах з'явяцца вуліцы, названыя ў гонар знакамітых людзей нашай Радзімы – К. Тураўскага, Е. Полацкай і іншых. Бо любая назва – гэта помнік зямлі.

# Век зжыў, а розуму не нажыў...

**Праўду людзі кажуць: “Век зжыў, а розуму не нажыў”. З гадамі і я перастаў многае разумець. Не ўсё да мяне даходзіць згаго, што чую па радыё ці бачу па тэлебачанні.**

Радыёкропка ў мяне на кухні. Зручна так: і слухаеш, і курыш, ды й старая не крычыць, бо дым з цыгарэты ў хату не ідзе. Люблю вельмі слухаць віншаванні.. Словы добрыя юбілярам прысвячаюць, у іх гонар песні спяваюць. Радуюся, калі сустракаюцца знаёмыя прозвішчы маіх аднагодкаў і старэйшых мяне людзей. Дасць Бог, можа мне пашчасціць пажыць яшчэ крышку на гэтым свеце. А вось сэнс песень, якія спяваюць, незаўсёды разумею. Часта спявае Надзея Кадышава. Прыгожы ў яе голас, не горшы чым у нашай Галі "Русланавай". У нас так на вёсцы даярку Галю Міхасёву клічуць. Яна як крыху падап'е, дык усё “валенкі” спявае. Ды так хараша! Старыя кабеты, бывае, слухаючы яе, зажаляцца. Пра што гэта я вам пачынаў гаварыць? А пра Кадышаву. Ну дык, вы мне, людцы родныя, старому растлумачце, чаму яна так свайго мужыка ганіць? Ну, затрымаўся у дарозе. З кім такое небывае? Дзякуй Богу, Любушка гэта не выгнала яго з хаты і грошы з кішэняў у яго не выцягнула.

А сама гэта Назея што нарабіла? Напілася так, што не змагла дайсці дадому. З кім гэта яна піла ў гэтым садзе? Вядома ж, не адна. Хто ведае, якія яна, нецвярозая, выкрунтасы вычварала. Заўсёды ў нашых баб толькі мы, мужыкі, вінаватыя. Часта яшчэ песню перадаюць “Сорвали розу в семнадцать лет”. Хлусня. Дзе ж яна такі сорт руж знайшла, якія 17 гадоў цвітуць? Некалі ўкраў я ў Ганцавічах з клумбы адзін парастак гэтай калючкі. Кажуць, крадзенае добра расце. А тая ружа праз два гады здзічэла.

А хто мне растлумачыць сэнс заяў нашых спартыўных каментатараў кожны дзень у час спаборніцтваў?

На алімпіядзе ў Турыне яны пра вынікі казалі: “Удача отвернулась от наших спортсменов” , “Жаль призовых мест нам не досталось”. Хіба спорт - гэта латэрэя "Спортлато”? У ёй сапраўды выцягваюць бочачкі з мяшка з нумарам. Вось тут удача сапраўды адварочваецца.. Не чуў я, каб хто ў нашым раёне многа грошай выйграў. А што зараз па тэлевізары паказваюць? Сусед, мой, смаркач яшчэ, а ўжо прыбіў да хаты нейкую талерку. Ну вядома, на заробкі ў Маскву ездзіць. Каб у калгасе працаваў, не купіў бы. Учора кліча: “Зайдзі, дзед, на свет паглядзі”. Прытушыў я цыгарэту,

калошы ў яго на ганку зняў, сеў на слончык ля дзвярэй і пачаў глядзець у тэлевізар.

Людцы вы мае, як хораша. Мора шуміць, кветкі - вочы не адвесці, а людзі ўсе вясёлыя. Адразу відаць, і ім таксама пенсію своечасова, як і ў нас, з 18-га чысла кожнага месяца даюць. Стараюцца не адстаць і за мяжой. Неяк нялоўка было доўга сядзець у чужой хаце. Сабраўся сыходзіць, а сусед мяне затрымаў: “Посиди, Петрович, пока я тут с одним бакланом по трубе побазарю. Потом квакнем”. Дзе ён такіх слоў набраўся? Па якой трубе? І базараў у нас зроду на сяле не было. Муку, праўда, возяць, дык яе з машыны прадаюць. А бакланаў, мне казалі, на рыбгасе страляюць, каб яны рыбу не елі. На гэта нават патроны дармовыя даюць. І як гэта квакнем?

Выйшаў ён на двор, а пульт мне пакінуў. Я на ім на кнопачку нейкую націснуў - і бачу: маладыя дзяўчынка і хлопец цалуюцца. А потым... Хацеў гэтую брыдоту выключыць, а тут гэты “новы беларус” заходзіць і кажа: “Что, дед, на секс потянуло? Ну ты молоток.”

А каб па табе чорт бізуном. Я з хаты, а ён наўздагон: “Постой. Самую клубничку пропустишь”. Байструк! Двоешнік! Смаркач! Прыбег я на кухню, закурыў той бычок, што пакінуў. Уключыў радыё, а адтуль: “ Я ведь взрослая уже, ты целуй меня везде”. Цьфу! Мярзота.

# На карце больш не значацца

Зусім нядаўна перагортваў старонкі “Блакітнай кнігі Беларусі”. Раю і вам пазнаёміцца з ёю. Вы ўбачыце там цудоўныя каляровыя здымкі рачулак, азёр, вадасховішчаў нашай Бацькаўшчыны. Шмат у кнізе і цікавага даведачнага матэрыялу. З яго вы даведаецеся, што ў Беларусі больш 10 тысяч азёр, сумарная плошча якіх перавышае 2000 квадратных кіламетраў. Вялікіх азёр з плошчай звыш 20 квадратных кіламетраў ў нас ўсяго 9. Самае буйное з іх Нарач - 80 квадратных кіламетраў, самае глыбокае- Доўгае (Глыбоцкі раён) - 53, 7 метра. У рэспубліцы таксама пабудавана 130 штучных вадасховішчаў. Да самых вялікіх з іх адносяцца і наша- “Лактышы”, водная прастора якога складае 15,9 квадратных кіламетра.

Багата Беларусь і на рэкі - іх болей 20 тысяч агульнай працягласцю 90,6 тысячы кіламетраў. Улічваючы тое, што даўжыня экватара Зямлі складае 40,075 тысячы кіламетраў, то сваімі рэкамі мы маглі б двойчы аперазаць планету.

На тэрыторыі краіны, апрача рэк, азёр, водасховішчаў, маецца яшчэ 1915 каналаў агульнай працягласцю 17051 кіламетр.

Аднак сустракаюцца на старонках кнігі і балючыя, крыўдныя словы для кожнага беларуса : “былы”, “былое”, “ былая”. Усяго дзесяць гадоў назад яна выйшла ў свет. 1 там яшчэ назначаны ВодасховІшчы “Любашава” (плошча 0,76 квадратных кіламетра, даўжыня 1,3 кіламетра, глыбіня - 3,6 метра), “Раздзялавічы” (плошча - 1,98 квадратных кіламетра, даўжыня – 1,63 кіламетра, глыбіня - 9,9 метра). На жаль, ўжо зніклі з твару зямлі і на карце больш не значацца Любашаўскае і Дзяніскавіцскае водасховішчы, пакрысе вымірае і Раздялавіцкае. Цяпер ездзяць ганцавіцкія рыбакі за дзесяткі кіламетраў на ацалелыя азёры, старыя каналы ды абмялела - выпраўленыя меліяратарамі рэкі ў надзеі злавіць хаця б аднаго карася.

Такая непамерна вялікая цана, такая неміручая расплата за нашы безаглядна - бяздумныя адносіны да матухны – прыроды!

Каб падобнае больш не паўтарылася, хачу звярнуць увагу кампнетэнтных асоб, экалагичнай службы раёна на пляж Паўдневы, так званы кар'ер, дзе ганцаўчане яшчэ могуць пакупацца, налавіць рыбу, адпачыць. Гэты вадаём, на жаль, сам - насам змагаецца з людзьмі, каб выжыць, каб ачысціцца, не ператварыцца ў вялікую, даруйце за слоеа, памыйніцу. Бо не сакрэт, што многія людзі, якія тут адначываюць, засмечваюць берагі ды і сам вадаем разнастайным смеццем, разбураюць

тут малыя архітэктурныя формы, ловяць рыбу забароненымі прыладамі, нярэдка выкарыстоўваюць пнляж для мыцця сваіх аўто...

Мне здаецца, што інспектары аховы навакольнага асяроддзя і работнікі праваахоўных органаў сюды заглядваюць рэдка. Парушальнікаў чысціні час ўжо караць рублём.

Не пашкодзіла б і членам БРСМ (на Паўднёвым ў асноўным адпачывае моладзь) праявіць ініцыятыву і ўзяць шэфства над пляжам. Тут трэба пачысціць берагі ад кустоўя, абнавіць пляжны пясок, добраўпарадкаваць месцы для адпачынку, абсталяваць спартыўныя пляцоўкі.

Мне здаецца, што ў гэтай снраве дапамаглі б моладзі многія прадпрыемствы і арганізацыі горада, прыватныя прадпрымальнікі ды і самі жыхары. Вельмі ж не хочацца, каб гэты вадаём загінуў, а нашы нашчадкі - дзеці, унукІ толькі са слоў старэйшых даведаліся, што некалі тут, побач з горадам, было цудоўнае месца адпачынку. 1м цяжка будзеў гэта паверыць. Як і цяпер мой сын не верыць мне, што колісь на рацэ майго дзяцінства Зяльвянцы я лавіў на вуду ментузоў, галаўнёў, міногу, яльцоў, жэраха, шмат іншай рыбы, якая цяпер адтуль бясследна знікла...

Што датычыць мяне, то для сябе я знайшоў райскі куточак для адпачынку ў Лахоўшчыне, што побач з Востравам і Начай. Якая асалода назіраць, як лунаюць у паветры рознакаляровыя стракозы, як ў празрыстай вадзе пабліскваюць бакамі стайкі печкуроў! Цікава сачыць за ганарлівымі, даўганосымі бусламі, з лёгкім сумам слухаць, як недзе побач, у высокай траве, плача перапелка. 1 я начынаю разумець, чаму так любіў гэтыя мясціны наш славуты зямляк - Міхась Рудкоўскі з, якім, на жаль, мне так і не давялося сустрэцца ў гэтым жыцці…

Я думаю, як зберагчы гэтае спрадвечнае хараство прыроды – матухны. І прапаную: давайце падумаем аб гэтым усёй грамадой.

**Я шчаслівы…**
**Зборнік вершаў і апавяданняў падрыхтаваны**
**Раённай дзіцячай бібліятэкай**

**Складанне і камп’ютэрны набор:**
**Мініч В.А.**
**Макатрэвіч А.К.**

**г.Ганцавічы, 2008г.**